*Плыві, квітней і велічна свяціся на хвалях часу, родная Смаргонь!* (Мар’ян ДУКСА)

# Светлы шлях

Мясцовая беларуская газета. Выдаецца ў Смаргоні з 23 лістапада 1944 года.

**2012**
**ПЯТНІЦА**
**27 СТУДЗЕНЯ**
**№4 (8412)**

# Свята снежнае і завейнае




Фота Міхаіла РАЗУМНІКА.

**Самы актыўны ўдзел у мерапрыемстве прынялі работнікі агрэгатнага завода Дзяніс ПАЎЛЮКОЎСКІ, Дзяніс ВОЙТКА, Алена БІРУКОВА, Павел НАЙДЗІЧ.**



**СВАЁ ЗІМОВАЕ СВЯТА - СУСВЕТНЫ ДЗЕНЬ СНЕГУ - ПРЫРОДА АДСВЯТКАВАЛА Ў НАШЫМ РАЁНЕ СНЕГАПАДАМ І ЗАВЕЯЙ. АЛЕ ГЭТА НЕ ПЕРАШКОДЗІЛА СПАРТСМЕНАМ, ПРАФЕСІЯНАЛАМ І АМАТАРАМ, САБРАЦЦА РАЗАМ НА ЎЖО АБКАТАНАЙ ЛЫЖНІ Ў ПАРКУ “ПЕРАМОГІ”.**

Як адзначыў намеснік старшыні райвыканкама Генадзь Бычко, інтрыга гэтага мерапрыемства ў тым, што мы да апошняга не ведалі, ці адбудзецца яно: якое ж свята снегу без снегу? Але прырода не падвяла. На думку Генадзя Паўлавіча, пытанне аб актуальнасці такіх агульнараённых спартыўных свят нават стаяць не павінна, гэта ж здароўе кожнага чалавека. І сам ён рады пракаціцца з вецяркoм на лыжах, таму з задавальненнем прыняў прапанову выступіць за каманду райвыканкама.

Першымі трасу апрабавалі школьнікі ў эстафеце 4х1000. Не першы год заўважаю, што ў зімовых відах спорту ўпэўненае лідарства трымаюць сельскія школьнікі. Вось і на гэты раз з першага ж этапу эстафеты наперад вырвалася каманда Сольскай школы. І сваю перавагу ўжо нікому не аддала - скончыла эстафету таксама першай. Літаральна ў спіну дыхалі сельскім спартсменам лыжнікі з Крэва і Бялкоўшчыны. Яны і занялі другое і трэцяе месцы адпаведна.

Дарослая эстафета прынесла адразу некалькі сюрпрызаў. На першым этапе, які беглі жанчыны, амаль плячом да пляча фінішыравалі каманды РАУС і ўпраўлення адукацыі райвыканкама, спартсменка з каманды міліцыі была трошкі хутчэйшай за сваю саперніцу. Але ўжо на другім этапе каманда педагогаў выхапіла лідарства і трымала яго да самага фінішу. А вось міліцыянеры не трапілі нават у тройку прызёраў. На другім месцы фінішыравалі вайскоўцы з в/ч 2044, на трэцім - супрацоўнікі Інстытута пагранічнай службы.

*(Заканчэнне на 4-й стар.).*

**Падпішыся - і чытай свой “Светлы шлях”**

Падпісная цана на месяц:
**індывідуальная – 9380 руб.** *(падпісны індэкс 64028)*;
**ведамасная – 19560 руб.** *(падпісны індэкс 64166)*.

*ПАДПІСАЦЦА НА ГАЗЕТУ МОЖНА Ў ЛЮБЫМ АДДЗЯЛЕННІ СУВЯЗІ, У ПАШТАЛЬЁНАЎ.*

## Ільготнае крэдытаванне будаўніцтва жылля

У 2012 годзе Беларусбанк планує накіраваць на льготнае крэдытаванне жылля Br6,4 трлн. За гэтыя сродкі з дзяржаўнай падтрымкай будзе пабудавана 4 млн. 200 кв. м жылля, у тым ліку 1 млн. кв. м - у Мінску. Аб гэтым паведаміў старшыня праўлення ААТ “ААБ Беларусбанк” Сяргей Пісарык.

Паводле слоў кіраўніка Беларусбанка, з агульнай сумы ў Br6,4 трлн. уласныя сродкі банка на фінансаванне льготнага крэдытавання будаўніцтва жылля складуць Br250 млрд.

Адказваючы на пытанне аб тым, як зменіцца льготнае крэдытаванне ў сувязі з прыняццем указа №13, Сяргей Пісарык растлумачыў, што грамадзяне, якія ўжо заключылі з банкам дагавор на крэдытаванне, будуць крэдытавацца на старых умовах. Што датычыцца тых, хто не паспеў заключыць крэдытны дагавор, то ім давядзецца пачакаць. На працягу месяца ў выканкамах будзе праходзіць зверка спісаў маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў на прадмет адпаведнасці або неадпаведнасці палажэнням указа №13. “Толькі пасля гэтай зверкі на аснове спісаў мы адновім крэдытаванне”, - сказаў Сяргей Пісарык.

Цяпер банк прадаўжае выдаваць крэдыты для маючых патрэбу ў паляпшэнні жылёвых умоў па стаўцы 31 працэнт гадавых. Паводле яго слоў, такая стаўка “нявыгадна для банка, але мы разумеем нашу ролю, нашу місію”. Калі апраўдаецца прагноз па зніжэнні інфляцыі ў гэтым годзе, стаўка па крэдытах будзе зніжацца.

Акрамя таго, Беларусбанк выдае камерцыйныя крэдыты пад будаўніцтва жылля па стаўцы 49 працэнтаў гадавых, пры гэтым кошт такіх крэдытаў у Беларусбанку ніжэйшы, чым у іншых камерцыйных банках краіны.

**БелТА.**

### К СВЕДЕНИЮ ЖИТЕЛЕЙ СМОРГОНСКОГО РАЙОНА

С 1 февраля 2012 года в магазине «КОРОНА» **мясная продукция** будет реализовываться по графику для следующих категорий:

**1 среда месяца** - для ветеранов Великой Отечественной войны и инвалидов 1 группы;

**2 и 3 среда месяца** - для инвалидов 2 группы;

**4 среда месяца** - для многодетных семей и семей, воспитывающих детей-инвалидов в возрасте до 18 лет.

Продажа будет производиться на основании удостоверения и паспорта **1 раз в месяц**.

ОРГАНИЗАЦИИ ТРЕБУЕТСЯ МАШИНИСТ АВТОВЫШКИ.
Справки по тел. 2-24-43, 3-30-28.
ООО “СУ-95”. УНН 500288476.

«ФАСОН» РАСПРОДАЖА ЗИМНЕГО АССОРТИМЕНТА
ОБУВЬ, ТРИКОТАЖ, ВЕРХНЯЯ ОДЕЖДА
ул. Танкистов, 2а.
Тел. 8 01592 62 000.
ИП Илюкович М. Е. УНН 590334539

город Сморгонь, межгород
Ваше ТАКСИ
Нам с Вами по пути!
круглосуточный вызов такси по телефонам:
(8-01592) (8-044) 72 (8-033) 65 5-444-5

К сведению населения
ВЕЩЕВОЙ РЫНОК
с января 2012 г. располагается в микрорайоне «Восточный».
Режим работы: вторник-воскресенье, с 7.00 до 15.00.
Приглашаем за покупками!

ГЛХУ «Сморгонский опытный лесхоз» приглашает на работу ВАЛЬЩИКОВ ЛЕСА.
Зарплата сдельная от 3 млн. руб.
Подвозка из г. Сморгонь к месту работы осуществляется транспортом лесхоза.
Кон.тел.: 2-13-58, 3-24-61.
УНП 500063150.

Время покупать семена!
Широкий ассортимент семян, средств защиты и ухода за растениями.
Ждем Вас по адресу: ул. Советская, 8а, ЦУМ.
ЧАУП “Нива-3ОС”. УНП 590842642.

Швейному предприятию ООО «Кружева» по пошиву корсетных изделий г. Сморгонь, пр-т Индустриальный, 26, ТРЕБУЮТСЯ: швеи
• Работа по скользящему графику: 2 дня по 12 часов, 2 дня выходной.
• Зарплата после стажировки от 1,5 млн. руб. до 2,5 млн. руб.
• Настильщик кружев.
• Полный социальный пакет.
Тел.: 8 (01592) 3-75-32, 857-44-01 МТС, 302-58-06 velcom.